**УДК 316.74:613.88-055.25(476-22)(091) DOI 10.52928/2070-1608-2023-67-2-114-118**

# АСАБЛІВАСЦІ ДАШЛЮБНАГА ЖЫЦЦЯ ЗАХОДНЕПАЛЕСКІХ СЕЛЬСКІХ ДЗЯЎЧАТ: ТРАДЫЦЫІ І ТРАНСФАРМАЦЫІ (ПА МАТЭРЫЯЛАМ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ)

***А.А. СЕЛЯХ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню аднаго з кампанентаў дзявочай штодзённасці – дашлюбных дачыненняў. Праз разгляд традыцый і трансфармацый у сэксуальнай культуры вёскі аналізуюцца асобныя сюжэты інтымнага свету дзяўчыны. Геаграфічна даследаванне ахоплівае гісторыка-этнаграфічны рэгіён Заходняе Палессе. Праблема асэнсоўваецца праз прызму ўспамінаў жаночага насельніцтва, сабраных аўтарам у сельскіх мясцовасцях Берасцейшчыны. Палявыя матэрыялы транслююць “галасы мінулага” аб штодзённасці дзяўчат, іх жыццёвым практычным і пачуццёва-эмацыйным вопыце. Аналіз сабраных этнаграфічных даных, увядзенне іх у навуковы зварот спрыяюць больш глыбокаму асэнсаванню гістарычна зменлівага сацыякультурнага ландшафта заходнепалескай вёскі, неад’емную частку якога складалі падыходы і каштоўнасныя арыентацыі, у святле якіх канструяваліся дашлюбныя адносіны.*

***Ключавыя словы:*** *дашлюбнае жыццё, сэксуальная культура, сельскія дзяўчаты, заходнепалеская вёска.*

**Уводзіны**. Традыцыі дашлюбных дачыненняў ва ўсе часы з’яўляліся неад’емным фактарам сацыякультурнага канструявання грамадства. Ігнараванне гэтага складнікавага аспекта культуры істотна збядняе працэс вывучэння вясковай штодзённасці, не дазваляе дасягнуць паўнаты гістарычнай рэканструкцыі сялянскага ладу жыцця. Акрамя таго, як слушна зазначыў даследчык У.А. Лобач, вывучэнне і рэактуалізацыя традыцыйнага досведу ў галіне сэксуальных паводзінаў набывае не толькі навукова-мемарыяльнае, але і шырокае грамадскае значэнне, што звязана з размыццём маральна-каштоўнасных арыенціраў, актыўнай камерцыялізацыяй сэксуальнасці ў сучасным беларускім грамадстве [1, с. 208]. Навуковая зацікаўленасць партэналагічным дыскурсам падштурхнула да пастаноўкі пытання пра спецыфіку дашлюбнага жыцця сялянскай дзяўчыны. Вывучэнне інтымнага боку жыцця немагчыма без разгляду механізмаў, якія рэгулявалі і кантралявалі яго. Такім чынам, першарадным ёсць агляд сэксуальнай культуры заходнепалескага сельскага соцыўма. Сэксуальная культура разумеецца як сукупнасць норм, каштоўнасцей, арыентацый, рэгулюючых адносіны ў грамадстве адносна інтымнай, рэпрадуктыўнай, сямейна-шлюбнай сфер. Метадалагічнай асновай даследавання з’яўляецца сацыякультурны падыход, які дазваляе перанесці “сэксуальнасць” і “інтымнасць” з прыроднага і фізіялагічнага свету ў свет культуры і грамадства.

Мэта артыкула – разгляд дашлюбнага жыцця дзяўчат ва ўмовах сацыякультурных трансфармацый, якія адбываліся ў сялянскім асяроддзі Заходняга Палесся ў савецкі перыяд.

Даследаванні сэксуальнасці ў культуралагічным дыскурсе нельга назваць маргінальнымі ў айчыннай навуцы на сучасным этапе яе развіцця. У рэчышчы гісторыка-антрапалагічнага, сацыякультурнага падыходаў даследчыкамі (У.А. Лобач, Т.В. Валодзіна, Л.В. Ракава) былі асэнсаваны такія пытанні, як традыцыі дашлюбных дачыненняў, эратычны сімвалізм у фальклоры і абраднасці, народная фізіялогія і антрапалогія і інш. Праблема інтымнага боку жыцця асобных сацыяльных і полаўзроставых катэгорый, у прыватнасці, сялянскіх дзяўчат, спецыяльнага этналагічнага разгляду не атрымала. Асобныя аспекты атрымалі пэўнае асвятленне ў кантэксце разгляду наступных аспектаў традыцыйнай культуры: дашлюбныя дачыненні [2–5], народныя ўяўленні аб жаночай фізіялогіі [6–8], эротыка ў моладзевай субкультуры [1].

Разглядаемая тэма даволі спецыфічная, паколькі тычыцца інтымнага, таемнага, прыхаванага боку чалавечага жыцця. У гэтай сувязі найбольш дарэчным, на наш погляд, было выкарыстанне крыніц, якія “кажуць самі за сябе”. Ключавым метадам быў абраны метад палявых этнаграфічных даследванняў. Асноўную частку крыніц для даследавання склалі палявыя матэрыялы, сабраныя аўтарам у сельскіх мясцовасцях Берасцейшчыны 2015–2022 гг. Апытанне праводзілася сярод жаночага насельніцтва 1930–1960-х гадоў нараджэння. Безумоўна, мы не можам гарантаваць дасканалую рэканструкцыю светаглядных уяўленняў тагачаснага грамадства, але ёсць магчымасць адлюстраваць рэальную штодзённасць асобных людзей з іх пачуццямі і перажываннямі.

Даследчыка цікавіць наступнае: на аснове матэрыялаў вуснай гісторыі вызначыць перыяд, у які быў пакладзены пачатак трансфармацыі традыцыйнага культурнага ландшафту (у тым ліку культуры дашлюбных зносін як яго складнікавай часткі) заходнепалескай супольнасці. Ужываючы прыметнік “традыцыйны” ў дачыненні да паняццяў “культура”, “грамадства”, мы маем на ўвазе адметную сацыякультурную рэальнасць, якая была ўласціва заходнепалескай вёсцы прыкладна да сярэдзіны ХХ ст. Гэтая рэальнасць характарызавалася пэўным ладам жыцця (аграрным, патрыярхальным) і спосабам мыслення (рэлігійным), агульнымі для ўсіх чальцоў грамады і перадаваемымі міжпакаленна.

**Асноўная частка**. Сэксуальная культура карэлявалася з ладам жыцця, які быў уласцівы грамадству ў канкрэтны перыяд яго развіцця. Зразумела, што традыцыйнаму грамадству з міфапаэтычнай мадэллю свету быў рэлевантны спецыфічны падыход да “інтымных” пытанняў. Па-за нормай заставаліся тлумачальныя размовы маці з дачкой пра пытанні жаночай фізіялогіі, палавых дачыненняў, за якімі замацоўваліся матывы нечысціні,

ганебнасці, небяспекі і забароны. Але з самага дзяцінства метадам простага назірання дзяўчынка засвойвала навакольны, у тым ліку, інтымны свет. Сама вясковая штодзённасць падносіла своеасаблівыя ўрокі "палавой асветы", дзе міжвольнымі педагогамі выступалі часам самі бацькі, а таксама сваякі, суседзі. Нярэдка дзеці былі сведкамі ўнутрысямейнага інтымнага жыцця бацькоў, маглі прысутнічаць падчас родаў, якія прымаліся ў хаце. Але такое спарадчнае назіранне за рэаліямі дарослага жыцця ў дзяцінстве ўспрымалася як дадзенасць і сур'ёзна не асэнсоўвалася.

Найбольш вызначальнымі ўласцівасцямі традыцыйнага грамадства, якія прадвызначалі стаўленне да інтымнага, сэксуальнага з'яўляюцца наступныя: дамінаванне калектыўнага над індывідуальным, публічнасць жыццядзейнасці, сацыяльна-групавая іерархізацыя, высокі ўзровень рэлігійнасці, значнасць захавання гонару рода. З дзяцінства жыццё дзяўчыны было запраграмавана на яе далейшую рэалізацыю ў вясковым асяроддзі. Даволі значным было падтрымліваць добры грамадскі статус. У выпадку праступкаў дзяўчыну чакалі санкцыі: *"Еслі у девушки плохое поведение, вот, еслі она дружэла, дружэла з парнем і он её бросил, чі забеременіла – её на уліцу не выпустят. Будут абзывать, дразніть. Бывало, з туалета адходы чы памоі возьмут і дверы, парог абальют. Ілі нарісуют, напішут што"*[1]; *"Былі в нас распусты. Аборты на дому делалі бабкі…некоторые рожалі. Но вжэ ні могла она на уліцу выйті, её не выпускалі...Вжэ она добра не відела. З её насміхалысь"*[2]. Дзяўчаты, якіх вінавацілі ў пазашлюбных палавых сувязях, таксама як і няверныя жонкі ў статусным дачыненні знаходзілася на маргенезе. У іх адрас, як сведчаць аповеды жанчын з розных раёнаў Берасцейшчыны, выкарыстоўвалі спецыфічныя пазыўныя: *совушча, лярва, гуляшча, роспусныця, кропэвныця, патра, курва, патаскуха, шлёндра, валацюга*. Рэспандэнткі ўспаміналі, што для дзяўчыны непрыстойным было гуляць з хлопцам па вёсцы ўдзень, весці з імі гутарку на вачах у грамады, зайсці да яго ў хату і нават паказваць калені: *"Колыся, шоб хлопцёві колына показав, то позорішчэ на всэ сэло. Опозорёна дівчына, ныхто з ёю ны говорэв"* [3]; *"Дівчата одна однэйі стыдалыся. Колэся, ну хто тобі коліна покажэ"*[4]. Успаміны жыхаркі в. Вялікія Лышчыцы Брэсцкага раёна 1930 г. н. сведчаць, што ў іх вёсцы старыя людзі асуджалі дзяўчат, якія дазвалялі сабе "нясціплыя" ўборы і казалі, што "…*они мужьям негодны, потому что в их не согретое тело, оно черствое и холодное"* [10, с. 19].

Аналіз этнаграфічных крыніц дае падставу зрабіць выснову аб дваістасці народнай маралі: з аднаго боку, строгія імператывы адносна цноты, з іншага – санкцыянаванае бацькамі і грамадой наведванне вячорак, што не выключала існавання практык дашлюбнага сэксуальнага жыцця. Аповеды інфармантак утрымліваюць яскравыя ўспаміны аб шматлікіх, у тым ліку эратычна маркіраваных, камунікатыўных практыках: заляцаннях, свавольствах, гульнях. Але факты сумесных начовак моладзі на вячорках у большасці гутарак адмаўляліся. Зафіксаваны толькі рэдкія, выключныя выпадкі такога роду свавольстваў: *"Некалі маці казала спалі на вечарках. Пасля 12 хазяйка, какая пусціла, прыносіла саломы куль. Расцілаюць, яку радюжку отдкідають, лажацца хлопцы і дівчата спаць. А рано встаючы ідуць додому"* [5]; *"Була бура, туча. І пошлі хлопці до девок на вэчоркі. Хлопец та заночував і получілась Надя. Забэрэменела дівчіна"*[6]. Жыхарка в. Плешчыцы Пінскага района 1928 г. н. адзначала наступнае: "У наша врэмя розныя былі, і тыя, хто да свадзьбы гулялі. Але ж калі дзеўка была чэснай, то болей цанілася…" [11]. Дэвіяцыі ў паводзінах маглі сабе дазволіць хлопцы і дзяўчаты з нізкай сацыяльнай адказнасцю, якія, як правіла, былі ізгоямі ўнутры самога моладзевага калектыву. Зазвычай, дзяўчаты дбалі пра свой сацыяльны (грамадскі і сямейны) статус, таму паслухмяна пераймалі існуючыя нормы паводзін: *"Колысь свою чэсносць пронэсэш гэтак як трэба… Дэ бувало покотыть хлопэць, за груды чы шчо…то очі выдыралы. І слухаты ны схочыш його, і ходыты ны схочыш"*[7].

Сур'ёзную дэзарганізацыю ў шлюбна-сямейныя адносіны і палавую мараль унеслі вайна і акупацыя. Размяшчэнне ў вёсках вайсковых кантынгентаў спараджала рост нараджальнасці пазашлюбных дзяцей. Аб шматлікіх фактах гвалтаванняў жаночага насельніцтва сведчаць успаміны: *"Кухорянку дівчіну згвалтувалы так: пошла, шарварок трэба було копаты в Запрудах, ровы там, ямы копаты. Оны ейі дэсь дам одвэлы, покотылы і всё. Замуж она ныколы так і нэ выходыла"*[8]; "*Старійшы казалы: "Ны дай Бог у войну буты дівчіною! То хужы нымае"*[9]. Лёсы дзяўчат, над якімі адкрыта здзекваліся, складваліся не самым лепшым чынам. Пакінуты на ўсё жыццё псіхалагічны адбітак уплываў на тое, што многія ахвяры гвалту ў далейшым так і не павыходзілі замуж. Некаторыя, як сведчаць успаміны, не змаглі нарадзіць у замужжы, што, у тым ліку, было выклікана наступствамі пазбаўлення ад нежаданага плода.

Сэксуальная культура пасляваеннага часу фарміравалася ў іншай сацыякультурнай, эканамічнай і дэмаграфічнай рэальнасці, стала месцам сутыкнення традыцыйнага і новага. Нарматыповая шлюбная мадэль была парушана, аб чым сведчаць вуснагістарычныя матэрыялы: "старыя" дзевы выходзілі замуж за ўдаўцоў, маладыя дзяў-

---

[1] Запісана аўтарам у 2017 г. ад Жук І.Р., 1943 г.н. у агр. Дзівін Кобрынскага р-на.
[2] Запісана Дацкевічам А.А. і Селях А.А. у 2015 г. ад Лоневай А.П., 1931 г.н. у в. Нікольская Маларыцкага р-на.
[3] Запісана аўтарам у 2018 г. ад Балка П.С., 1930 г.н. у в. Лелікава Кобрынскага р-на.
[4] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Сцепанюк А.П., 1946 г.н. у в. Заор'е Маларыцкага р-на.
[5] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Шавель М.І., 1938 г.н. у в. Вуглы Івацэвіцкага р-на.
[6] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Губенскай М.Д., 1930 г.н. у в. Варатынічы Кобрынскага р-на.
[7] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Пашкевіч Я.А., 1942 г.н. у в. Спорава Бярозаўскага р-на.
[8] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Губенскай М.Д., 1930 г.н. у в. Варатынічы Кобрынскага р-на.
[9] Запісана аўтарам у 2021 г. ад Саўчук Г.С., 1933 г.н. у в. Сварынь Драгічынскага р-на.

чаты шлі “на двое, трое, пяцёра дзяцей”, мужчыны жаніліся на жанчынах з байструкамі. Аб трансфармацыі рэпрадуктыўных паводзін у сельскай мясцовасці ў пасляваенны час сведчыць узрост пазашлюбнай нараджальнасці [12, с. 71]. Страх усеагульнага асуджэння, перспектыва маргінальнага становішча, зламанага лёсу, у выпадку цяжарнасці па-за шлюбам, прымушалі дзяўчат прыбегнуць да абортаў. Дзяўчаты звярталіся да “бабак”, якія, як распавядалі жанчыны, *“выкальвалі”*, *“выдыралы”*, *“выжыгалы”* плод. Сустракаліся выпадкі, калі дзяўчаты самастойна, без дапамогі “спецыялістаў” імкнуліся спыніць цяжарнасць і “скінуты дытыну”: пілі нейкія настоі, саскоквалі з узвышшаў. Калі аборт зрабіць па розных прычынах не атрымоўвалася, дзяўчына магла забіць немаўля, патапіць, закапаць, альбо здзейсніць самагубства.

Вастрыня праблемы не магла не знайсці водгук з боку дзяржавы і 23 лістапада 1955 г. выйшаў указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР “Аб адмене забароны абортаў”, згодна з якім дазвалялася правесці аперацыю штучнага спынення цяжарнасці, але выключна ў стацыянарных лячэбных установах. Распачалося выдавецтва спецыяльнай перыёдыкі аб небяспечнасці падпольных абортаў для здароў’я і жыцця жанчыны, а таксама пра крымінальную адказнасць як абортмахераў, так і ўрачоў [13; 14]. Зразумела, што жаночае насельніцтва вёскі, у параўнанні з гарадскім, як і раней заставалася мала дасведчаным у пытаннях аховы здароў’я, нягледзячы на захады з боку дзяржавы. Раённы ўрач акушэр-гінеколаг адносна сітуацыі ў Кобрынскім раёне ў газеце за красавік 1957 г.: “Да нашага сораму, на сённяшні дзень выпадкі, калі жанчына з небяспекай для жыцця падвяргае сябе рызыцы, застаецца інвалідам на ўсё жыццё, не адзінкавы. Так, у лютым гэтага года ў гінекалагічны аддзел бальніцы паступіла хворая Р., у цяжкім стане, з рэзкім малакроўем пасля вялікага крывацячэння з прыкметамі заражэння крыві, якое наступіла ў выніку аборта, праведзенага па-за бальніцай” [15, с. 4]. Дзяўчаты па-ранейшаму працягвалі звяртацца за паслугамі да “бабак-невукаў”. Безумоўна, мы спасылаемся на рэдкія ў працэнтных суадносінах выпадкі, і нельга казаць пра тое, што факты дашлюбнай цяжарнасці, падпольных абортаў былі шматлікімі. Але іх наяўнасць – наступствы, у тым ліку, адсутнасці адкрытага дыялога аб інтымнай сферы жыцця ў сялянскім соцыўме.

Інтымізацыя пытання сэксуальных зносін працягвалася ў сялянскіх сем’ях і ў 1960–1970-я гады. Палавая асвета праводзілася, як правіла, завуалявана, з іншасказальным падтэкстам: *“на парня сільно нэ заглядай”*, *“пузо ны захватэ”*, “*в фартухові нэ прынэсэ”*. Гэтыя настаўленні ўспрымаліся дзяўчатамі як аксіёматычныя. Яны не патрабавалі тлумачэнняў і былі накіраваны на беспярэчнае паслушэнства. Палавое выхаванне карэлявалася са светапогляднай парадыгмай, на вяршыні якой знаходзіўся сацыяльны статус, а галоўным стрымліваючым фактарам быў страх, сорам, гонар. Гэты падыход фіксуецца ў фальклоры Піншчыны [16, с. 98]: “Тэпэр жэ ты, дочка, // Нэ деўка, нэ жонка, // Тэпэр жэ ты, дочка, // Людям поговорка”. Для дачкі значным таксама было годна падтрымліваць не толькі свой грамадскі, але і сямейны статус: *“Гляды! Шоб у прыполы ны прынэсла. Ны опозор, бо выжэну і знаты ны буду і відаты ны схочу*”[10]. Адсутнасць палавой асветы спрыяла трываламу замацаванню ў свядомасці дзяўчат міфалагічных поглядаў на асобныя аспекты інтымных дачыненняў. Калі дзяўчына заставалася з хлопцам сам-насам, яна імкнулася трымаць дыстанцыю. Любыя тактыльныя кантакты: пацалункі, абдымкі ў разуменні дзяўчыны мелі канатацыю страты цноты, што фіксуецца ў палявых матэрыялах: “*Помню мяне праважаў хлопец да хаты з танцаў. І вот ён цягне мяне за руку і нібы мяне пацалаваць хацеў. О, Божэ! Думаю, я вжэ буду бярэменна…*”[11]; *“Кода-то боялісь поцеловацца…а то вдруг деті пойдут. Раньше, як возьмёт девчіну за колено, і вжэ думалі, шо это ні девка, боялісь вдруг что-то будет”*[12].

Характарызуючы сітуацыю ў савецкім грамадстве, даследчык І.С. Кон зазначыў: “У 1950–1960-х гг. прагрэсіўныя савецкія педагогі, лекары і псіхолагі загаварылі аб неабходнасці палавога выхавання падлеткаў, якое разглядалася, перш за ўсё, як маральнае” [9, с. 297]. Што тычыцца вясковага грамадства Заходняга Палесся, яшчэ ў канцы 1960-х гадоў рана было казаць пра паўсюдную адкрытасць “інтымных” тэм. Палявыя матэрыялы сведчаць аб тым, што ў гэты час кабінет гінеколага ўпершыню наведваўся ў сувязі з цяжарнасцю, а калі быць дакладней, падчас родаў. Але пачатак змен быў пакладзены. Школы, тэхнікумы, інстытуты былі адукацыйнай платформай, у тым ліку, у сэксуальнай сферы. У 1960–1970-я гг. найбольш прагрэсіўныя класныя кіраўнікі пачалі праводзіць для дзяўчат-падлеткаў тэматычныя гутаркі наконт гігіены, жаночай фізіялогіі: *“Классный руководитель нас готовила как девушек ко всему. Помню, сидим возле печки, кругом девочки посадились и она говорит: Девочки, так и так… девочка созревает. Вы должны быть к этому готовы”*[13]; “*В семье нет, нам не рассказывали. А в школе была классная. Говорили с ней о гигиене”*[14]. Пазней у школу для правядзення лекцый пачалі запрашаць медычных працаўнікоў: “*Да нас у школу з амбулаторыі прыходыла медсестра, расказувала”*[15]; “*Я работала акушэркой, то в школі дівчатам беседы проводылы…темы: менструацыя, половое воспітаніе. Брошуркі былі разные”*[16].

Сыходзячы з успамінаў вынікае, што трансфармацыя сэксуальнай культуры ў сяле адбывалася параўнальна запаволенымі тэмпамі. Працэсы, якія адываліся ў вёсцы напрацягу 1950–1970-х гг.: фарміраванне новай

---

[10] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Гузарэвіч В.М., 1963 г.н. у в. Новы Двор Пінскага р-на.
[11] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Касцюк В.І., 1940 г.н. у в. Лазаўцы Івацэвіцкага р-на.
[12] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Пугачовай В.М., 1949 г.н. у в. Бярэзніца Пружанскага р-на.
[13] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Карэнько Н.І., 1953 г.н. у в. Дарапеевічы Маларыцкага р-на.
[14] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Ксёнда Н.І., 1960 г.н. у агр. Тышкавічы Іванаўскага р-на.
[15] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Янушчык Н.Л., 1962 г.н. у в. Бездеж Драгічынскага р-на.
[16] Запісана аўтарам у 2022 г. ад Міранюк С.С., 1945 г.н. у в. Навасёлкі Кобрынскага р-на.

культурна-адукацыйнай інфраструктуры (бібліятэкі, дамы культуры з прывазным кіно), урбанізацыя (эскалацыя гарадскіх культурных узораў, каштоўнасцей), канешне, садзейнічалі дэтабуацыі інтымнай прасторы жыцця сялянак, але не пазбавілі яе сакральнасці і таямнічасці. Сфарміраваныя напрацягу жыццядзейнасці не аднаго пакалення стабільныя формы маралі, сацыяльнай іерархіі, гендэрнага парадку яшчэ доўгі час рэгламентавалі дэмаграфічныя паводзіны вясковага насельніцтва: падыходы да шлюбу, дзетанараджэння, сэксуальных дэвіацый. Тлумачэнне гэтаму палягае ў гісторыка-палітычных працэсах, што адбываліся ў Заходнім Палессі. Знахожданне рэгіёна ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) забяспечыла кансервацыю высокага ўзроўню рэлігійнасці насельніцтва, што “садзейнічала больш працягламу захаванню традыцыйных поглядаў на шлюб і сям’ю”, “захаванню ўплыву традыцый на паводзіны дзяўчыны” [17, с. 399]. Вывучаючы палесскую сельскую супольнасць у 30-х гг. ХХ ст. Ю. Абрэмбскі аналізаваў працэс яе распаду і адзначаў наступнае: “Інавацыйны рух, безумоўна, не ахоплівае ўсяго вясковага жыцця: яму не падаюцца тыя вобласці, якія датычаць інтымнай сферы індывіда, ці тыя, што падлягаюць рэгуляванню рэлігійна-магічнай сістэмай” [18, с. 12]. Падзеі Вялікай Айчыннай Вайны прыпынілі саветызацыю рэгіёна, што садзейнічала захаванню былога ладу яшчэ прыкладна на дзесяцігоддзе. Даследчыца І.В. Раманенка, разглядаючы дэмаграфічныя працэсы на Брэстчыне ў савецкі перыяд, зазначыла, што традыцыі і рэлігійны фактар, якія захаваліся тут у большай ступені, чым у іншых рэгіёнах БССР, па-ранейшаму вызначалі ўзровень нараджальнасці і склад сям’і і ў пасляваенныя гады. Так, па паказчыку агульнага каэфіцыента нараджальнасці ў 1950 – 1990-я гг. Брэсцкая вобласць саступала толькі Гомельскай. Колькасць жанчын, якія нарадзілі да шлюбу, у заходніх рэгіёнах БССР напрацягу ўсяго савецкага перыяду была ніжэй у параўнанні з усходнімі, што таксама тлумачыцца кансервацыяй традыцый і высокім узроўнем рэлігійнасці [17, с. 399–400, 403]. Заўважны падрыў сэксуальнай культуры вёскі нанесла зрушэнне міжпакаленнай трансмісіі культуры. Змены ў міжпакаленных сувязях, на думку І.І. Калачовай, аказалі значны ўплыў на дэмакратызацыю дашлюбнага перыяду жыцця ў 70-х гг. ХХ ст. [19, с. 41]. Дзяўчаты пасупова інтыгруючыся ў новы культурны каштоўнасна-сэнсавы ландшафт пачалі ўспрымаць і пазіцыянаваць сябе асабняком ад вясковай грамады. 1970-я – 1980-я гг. сталі часам, калі мяняліся жыццёвыя прыярытэты сялянак: важным становіцца не толькі замужжа і нараджэнне дзяцей, але і атрыманне адукацыі [5, с. 179].

**Заключэнне**. Вусныя ўспаміны заходнепалескіх жанчын аб асабістым практычным, пачуццёва-эмацыянальным жыццёвым вопыце раскрываюць асаблівасці дзявочага інтымнага свету тагачаснага грамадства. Палявыя матэрыялы сведчаць аб тым, што дашлюбныя дачыненні канструяваліся на базе сэксуальнай культуры, якая знаходзілася ў карэляцыі з ладам жыцця, уласцівым заходнепалескай вёсцы ў канкрэтны час. Жыццё дзяўчыны ў грамадстве з традыцыйнымі маральна-рэлігійнымі рысамі было запраграмавана ўстаноўкай на “своечасовасць” рэалізацыі матрыманіяльнага і рэпрадуктыўнага “прызначэння”. Адсутнасць палавой асветы ў сям’і і школе, рытуалізацыя, фальклярызацыя, міфалагізацыя інтымнай сферы, і, што найбольш значна, высокі ўзровень рэлігійнасці, садзейнічалі фарміраванню страху ў дзяўчат і прадвызначалі іх дашлюбныя паводзіны. Асноўня стратэгічная задача дзяўчыны была пазбегнуць пазашлюбнай цяжарнаці і тым самым захаваць гонар свайго роду.

Значны ўрон інтымнай прасторы дзяўчат нанесла вайна, наступствы якой пакінулі заўважны адбітак на шматлікіх дзявочых долях. Але найбольш заўважныя змены ў сэксуальнай культуры заходнепалескай вясковай супольнасці распачаліся прыблізна ў 70-я – 80-я гг. ХХ ст. У гэты час назіраецца злом былога сацыяльнага парадку ў вёсцы: паслабленне рэгламентуючай ролі сям’і і грамады на фоне індывідуалізацыі грамадскага жыцця. Інтымнае жыццё дзяўчыны паступова пераставала быць зонай кантролю грамады і пряцякала ў іншай сацыякультурнай рэальнасці.

## ЛІТАРАТУРА


1. Лобач У.А. Эрас у беларускай традыцыйнай культуры // Studia mythologica slavica. – 2003. – № 6. – S. 205–248.
2. Швед І.А. Вяселле на Берасцейшчыне: перадшлюбны перыяд // Астрамечаўскі рукапіс: брэсцкі раён. краязн. альм. – 2015. – № 1. – С. 8–12.
3. Ракава Л.В. Традыцыі дашлюбных зносін моладзі ў беларусаў у ХІХ – першай палове ХХ ст. // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск: Права і эканоміка, 2009. – Вып. 6. – С. 475–482.
4. Захарэвіч А.Б. Дашлюбныя адносіны беларусаў Падзвіння ў канцы ХІХ – першай палове ХХ ст. // Труды молодых специалистов ПГУ, Гум. науки. – 2010. – Вып. 41. – С. 60–62.
5. Лавриновская И. В. Особенности добрачной и семейной жизни сельской женщины в Белорусском Полесье в советский период // Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі да 150-годдзя А. К. Сержпутоўскага, 19–20 чэрв. 2014 г., Мінск / уклад.: А.Г. Алфёрава, С.У. Грунтоў, Ю.С. Пракоф’ева. – Мінск, 2014. – С. 177–183.
6. Валодзіна Т. Цела чалавека: слова, міф, рытуал. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – 431 с.
7. Валодзіна Т. Жанчына і жаночае ў традыцыйным светапоглядзе беларусаў // ARCHE. – 2011. – № 12(111). – С. 266.
8. Гугнюк А.А. Жаночая фізіялогія ў традыцыйных уяўленнях беларусаў (на прыкладзе заходнепалескай вёскі) // Беларусь у гістарычнай рэтраспектыве ХІХ – ХХІ стагоддзяў: этнакультурныя і нацыянальна-дзяржаўныя працэсы: матэрыялы Рэсп. навук. канф., Гомель, 14 кастр. 2021 г. / рэдкал.: А.Р. Яшчанка (гал. рэд.) і інш.; М-ва адукацыі Рэспублікі Беларусь, Гомельскі дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2021. – С. 64–68.
9. Кон И.С. Клубничка на берёзке. Сексуальная культура в России. – М.: Время, 2010. – 608 с.
10. Аповед пра народныя святы // Астрамечаўскі рукапіс. – 2021. – № 4. – С. 16–19.

11. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклора імя К. Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. – Ф. 6. Воп. 14. С. 134. Л. 51–55.
12. Лавриновская И.В. Трансформация репродуктивного поведения белорусских сельских женщин: динамика отношений к внебрачным рождениям // Современная молодежь и общество: сб. науч. ст. – Минск, 2013. – Вып. 1. – С. 68–72.
13. Персианинов Л.С. Аборт и его последствия. – Минск: Гос. изд-во БССР, 1960. – 41 с.
14. Дазорцава Г.Л. Жаночыя хваробы. – Мінск: Выд-ва ЦК КПБ, 1957. – 43 с.
15. Фёдарава М. За здароў’е жанчын // Праца. – 1957. – 17 крас. – № 45 (1353).
16. Шепелевич В.В. Песни деревни Ковнятин Пинского района / Науч. ред. Ф.Д. Климчук. – Пинск: Паляшук, 2014. – 159 с.
17. Этнокультурные процессы Западного Полесья (Брестчины) в прошлом и настоящем / А. Вл. Гурко и др.; науч. ред. А.Викт. Гурко; Нац. акад. наук Беларуси, Центр исслед. белорус. культуры. языка и лит., Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора К. Крапивы. – Минск: Беларус. навука, 2020. – 621 с.
18. Палессе, якога не ведаем. Фота-этнаграфічная выстаўка / Пад рэд. А. Энгелькінг. – Брэст; Пінск; Кобрын; Мінск. – Сакавік–верасень, 1997. – 31 с.
19. Калачёва И.И. Семья и брак в БССР в 70–80-х гг. ХХ в. // Вышэйшая школа: нав.-метад. і публ. час-с / Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т. – 2016. – № 6. – С. 40–45.


*Пастурпіў 03.04.2023*

## ОСОБЕННОСТИ ДОБРАЧНОЙ ЖИЗНИ ЗАПАДНОПОЛЕССКИХ СЕЛЬСКИХ ДЕВУШЕК: ТРАДИЦИИ И ТРАНСФОРМАЦИИ (ПО МАТЕРИАЛАМ УСТНОЙ ИСТОРИИ)

***О.А. СЕЛЯХ***
***(Белорусский государственный университет, Минск)***

*Статья посвящена осмыслению одного из компонентов девичьей повседневности – добрачных отношений. Через рассмотрение традиций и трансформаций в сексуальной культуре деревни анализируются отдельные сюжеты интимного мира девушки. Географически исследование охватывает историко-этнографический регион Западное Полесье. Проблема осмысливается через призму воспоминаний женского населения, собранных автором в сельских местностях Брестчины. Полевые материалы транслируют "голоса прошлого" о повседневности девушек, их жизненном практическом и чувственно-эмоциональном опыте. Анализ собранных этнографических данных, введение их в научный оборот способствуют более глубокому осмыслению исторически изменяющегося социокультурного ландшафта западнополесской деревни, неотъемлемую часть которого составляли подходы и ценностные ориентации, в свете которых конструировались добрачные отношения.*

***Ключевые слова:*** *добрачная жизнь, сексуальная культура, сельские девушки, западнополесская деревня.*

## FEATURES OF THE PREMARITAL LIFE OF RURAL GIRLS OF WESTERN POLESIE: TRADITIONS AND TRANSFORMATIONS (BASED ON ORAL HISTORY MATERIALS)

***A. SELYAKH***
***(Belarusian State University, Minsk)***

*The article is devoted to understanding one of the components of a girl's everyday life – the intimate sphere. The author examines the traditions and transformations in the sexual culture of the village and analyzes some of the plots of the girl's intimate world. Geographically, the study covers the historical and ethnographic region of Western Polesie. The problem is comprehended through the prism of the memories of the female population, which the researcher collected in rural areas of the Brest region. Field materials broadcast "voices of the past" about the everyday life of girls, their practical and sensual-emotional experience. The analysis and introduction into scientific circulation of ethnographic materials helps to understand more deeply the socio-cultural landscape of the West Polesie village, which has changed historically. Approaches and value orientations by which people constructed sexual behavior are an integral part of the culture of the Western Polesie.*

***Keywords:*** *intimate life, sexual culture, rural girls, village of Western Polesie.*